УДК 94(438)

# ПРАВА *LIBERUM VETO* Ў СІСТЭМЕ ШЛЯХЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

*Клімуць Лада Яраславаўна*
дацэнт кафедры гісторыі і філасофіі ўстановы адукацыі «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*У дакладзе разглядаюцца сутнасць і асаблівасці выкарыстання liberum veto падчас пасяджэнняў сеймаў Рэчы Паспалітай.*

*Liberum veto* – канцэпцыя досыць цікавая. Нельга сказаць, што наконт яе вядуцца бурныя дыскусіі ў сучаснай навуцы. Але адсутнасць спрэчак не азначае, што на сёння ў інтэрпрэтацыі гэтай з'явы можна паставіць кропку. Наадварот, прыйшоў час пачаць такую неабходную, на наш погляд, дыскусію.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У літаратуры права вета традыцыйна разглядаецца як праява трымання шляхтай за свае прывілеі і павага да прынцыпу згоды. З другой паловы XVII ст. *liberum veto* сталі прыводзіць як доказ хібаў у самой палітычнай сістэме і як праяву адмоўных рысаў саміх грамадзян (эгаізм, схільнасць да анархіі, ірацыянальны страх перад цэнтралізаванай уладай). Адсюль і сувязь гэтай інстытуцыі з падзеламі Рэчы Паспалітай (далей – РП).

Аднак не ўсё так проста. У дзяржаўнай сістэме, заснаванай на федэралізме, *liberum veto* можна лічыць неабходным. Яно забяспечвае тое, што мацнейшы бок не зможа навязаць сваю волю слабейшаму. Выкарыстоўваючы гэта права, слабейшы бок мае магчымасць спыніць працэс, які пагражае яго правам. Такім чынам, да падзелаў прывяло не існаванне права *liberum veto* як такога, а яго адвольнае выкарыстанне з сярэдзіны XVII ст.

*Liberum veto* – сродак прыйсці да паразумення. Асновай для ідэі *liberum veto* з'яўляецца аднагалоссе. Сутнасць у тым, каб з прынятым рашэннем былі згодныя ўсе прысутныя. Да такой згоды прыходзілі не таму, што людзі думалі аднолькава, да яе прыходзілі праз дыскусіі і кампраміс, г. зн. кансэнсус. На думку даследчыкаў, эфектыўнасць гэтага сродку тлумачылася высокай палітычный культурай шляхты [4, с. 17]. Акрамя *liberum veto* паслы маглі выкарыстоўваць іншыя формулы, цесна звязаныя з гэтым правам: *na nic nie pozwolę dopóki etc.* (нічога не дазваляю, пакуль), *nie pozwalam na prolongatę* (не дазваляю працягваць), *sisto activitatem* (прыпыняю дзейнасць), *protestatio*, *protestuje się* (пратэстую).

Выкарыстанне *na nic nie pozwolę dopóki etc.* не зрывала сейм, ён працягваў працу. Мэтаю пасла і не мог быць зрыў сейма. Гэта быў сігнал для далейшых перамоваў з улікам умоў, прапанаваных паслом, а значыць, тымі, хто яго адправіў на сейм. Гэта вяло да далейшых абмеркаванняў.

Таксама *sisto activitatem* у XVI ст. азначала не зрыў сейма, а прыпыненне. Гэта практыка служыла для працягу дэбатаў над канкрэтным пытаннем. Калі ж не маглі дамовіцца, заканчвалі дэбаты, але гэта не азначала, што паслы разыходзіліся. Яны пераходзілі да іншых пытанняў. З цягам часу *sisto activitatem* злілося з *liberum veto*.

Найбольш шырока выкарыстоўвалася пратэстацыя. Паслы дзейнічалі ад імя сваёй тэрыторыі згодна з атрыманымі інструкцыямі. Пратэставаць можна было супраць прынятых рашэнняў. Гэта практыка дыктавалася канкрэтным інтарэсам. У інструкцыях былі выказаны інтарэсы кожнай зямлі. А гэтыя землі і складалі РП.

Такое мноства метадаў паказвае, што *liberum veto* успрымалася як права пасла, але не прыводзіла да зрыву сеймаў. І да сярэдзіны XVII ст. асаблівых крызісаў з *liberum veto* звязана не было. У XVI – першай палове XVII ст. *liberum veto* – хутчэй абстрактная ідэя, якую па-рознаму можна было інтэрпрэтаваць. А мноства сродкаў гаворыць пра гнуткасць і здольнасць такой сістэмы да адаптацыі.

Выкарыстанне *liberum veto* патрабавала высокай адказнасці ад чалавека. Пасол разумеў, што гаворыць не ад свайго імя, ён прадстаўляе шляхецкае грамадства, якое адправіла яго на сейм і дало адпаведныя інструкцыі. І гэта частка грамадства павінна быць пачутай, яе думку трэба ўлічваць пры прыняцці рашэнняў. Закон – гэта не навязаны гвалтоўна абавязак, гэта тое, што рэгулюе жыццё дзяржавы дзеля дабрабыту яе грамадзян. Менавіта такія думкі кіравалі паслом, калі ён наважваўся не згаджацца з чым-небудзь на сейме.

Такое разуменне рэзка кантрастуе з некаторымі растырыжаванымі апісаннямі сеймаў РП як поўнага вэрхалу, бяздзеяння і беззаконня.

Цікава, што Чаплінскі, праца якога, па сутнасці, крытыкуе *liberum veto*, адзначае: "Адмоўна ацэньваючы сейм, часта забываюцца таксама, што польскі сейм, які ўзнік яшчэ ў XV ст., існаваў і дзейнічаў да канца XVIII ст., за 300-гадовую гісторыю меў, уласна кажучы, толькі 50 гадоў сапраўднай і амаль абсалютнай дэградацыі, са стану якой, дарэчы, пасля 1764 г. падняўся дзякуючы ўласным высілкам. Забываюць далей аб тым, што ў перыяд росквіту гэтага інстытуту абмеркаванні ў польскім сейме праходзілі не аднойчы лепей, чым у іншых саслоўных інстытутах, і што на сходах, дзе сутыкаюцца розныя погляды, паседжанні рэдка бываюць талковымі і спакойнымі, аб чым сведчыць хаця б гісторыя еўрапейскіх парламентаў XIX ст." [1].

Што тычыцца канкрэтных лічбаў, то за перыяд 1550–1600 гг. з 40 сеймаў закончыліся няўдачай з-за пратэстаў меншасці 9, ці 22%. У наступныя 50 год з 46 сеймаў безвынікова разышлося 6, ці 13%. І толькі ў другой палове XVII ст. колькасць сарваных сеймаў вырасла да 35% [1]. З канкрэтных прыкладаў можна прывесці наступныя. У 1596 г. пратэставаў Марцін Букавецкі, пасол велькапольскі, але не сарваў сейм, акрамя яго пратэставалі і іншыя польскія і літоўскія паслы. Таксама *liberum veto* выкарыстоўвалася на сейме 1609 г. [2, с. 358 ]. Пры праўленні Жыгімонта III Вазы (гэта 45 гадоў) 6 сеймаў закончылася нічым (1592, 1597, 1600, 1605, 1606 і 1615 г.) [3].

Як жа адбываліся падзеі на сейме, калі нейкая меншасць была супраць рашэнняў? Спрабавалі пераканаць апазіцыю хаця б не пратэставаць супраць прымаемых рашэнняў. Толькі калі справа была вельмі сур'ёзнай, калі пазіцыя таго, хто супраць, была вельмі абгрунтаванай, сейм саступаў, што не азначала аўтаматычна яго зрыў. Часцей за ўсё проста рвалі акт з праектам канстытуцыі і пераходзілі да іншых пытанняў. Сейм зрывалі тады, калі меншасць хацела, каб ён скончыўся нічым. Гэта быў сродак прымусіць караля да змены палітыкі [1]. Такім чынам, мы бачым, што ўсім вядомы дэмарш У. Сіцыньскага на сейме 1652 г. не быў першай спробай выкарыстання вольнага "не дазваляю". Чым тады адметны гэты выпадак і важная гэтая дата ў гісторыі? Дэпутат з Трокаў наклаў вета на далейшы працяг сейма, які ішоў ужо больш за ўстаноўленыя законам 6 тыдняў. Кіраваў ім польны гетман літоўскі Януш Радзівіл. З гэтага часу можна адлічваць тую дэградацыю і ўпадак сейма і палітычнай сістэмы РП увогуле, якія цягнуліся да сярэдзіны XVIII ст.

Калі паглядзець на гістарычныя фактары, якія ўплывалі на фарміраванне правілаў дэбатаў на сейме, то можна згадзіцца з У.Канапчыньскім у тым, што вопыт праўлення Генрыха, з якім часцей за ўсё была не згодная шляхта, і ідэя адзінства, закладзеная яшчэ ў Люблінскай уніі, гаварылі пра неабходнасць прытрымлівацца прынцыпа аднагалосся, каб усім добра было. Грамадствам рухала ўяўленне пра тое, што агульная воля народу складаецца з гармоніі памкненняў усіх грамадзян.

У XVI–XVII стст. у Еўропе ідзе працэс кансалідацыі ўлады манарха ў аўтакратычную мадэль (Францыя, Прусія, манархія Габсбургаў). Але былі краіны, дзе грамадзяне, звыклыя да самакіравання, адстойвалі свае грамадзянскія свабоды і выступілі супраць кансалідацыі палітычнай улады ў руках манарха (Англія, Нідэрланды і Рэч Паспалітая).

Той факт, што грамадзяне працягвалі абараняць ідэал кансэнсусу і сваё права на свабоду слова, якое ўключала і права на пратэст, нават пасля таго, як мноства сеймаў было сарвана, гаворыць аб тым, што, акрамя славутага кансерватызму, за гэтым стаяла яшчэ нешта важнае.

У перыяды высокай палітычнай культуры на сеймах (XVI – пачатак XVII ст) націск на меншасць ішоў такім чынам, каб не навязваць прыняцце рашэння, а дамовіцца, прапанаваўшы нейкія саступкі, то-бок кампраміс. Такім чынам стваралася поле для палітычнага гандлю без прыніжэння і адчування паразы аднаго з бакоў. У другой палове XVII ст. часта замежныя дзеячы падкупалі пасло на сейме, якія папросту зрывалі сам сейм.

Хоць *liberum veto*, безумоўна, паўплывала на крызіс дзяржавы ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст., яно не было задумана спецыяльна з такой мэтай. Для яго існавання было некалькі прычын. Перш за ўсё трэба памятаць, што РП была федэрацыяй розных зямель. Кожны пасол прадстаўляў свой рэгіён, і чакаць, што ва ўсіх землях будуць думаць аднолькава, супярэчыла б здароваму сэнсу. Тэарэтычна апазіцыя нават аднаго пасла магла прывесці да адрывання зямель ад РП. Ідэя была ў тым, каб не навязваць рашэнні, а зрабіць іх прымальнымі. Такім чынам, гэта не прымус да аднолькавых думак, а імкненне да адзінства. Як правіла, у апазіцыі выступаў не адзін пасол, стаўленне да нейкага рашэння магло быць падобным у некалькіх землях, але сутнасць у тым, што выкарыстанне права "не дазваляю" належала меншасці, што лагічна, бо большасць і так ужо "за". У гэтым сэнсе 1652 г. адметны тым, что Сіцыньскі ў адзіночку сарваў сейм. І цікава тое, што на самой справе большасць паслоў і сам кароль хацелі разысціся. Гэты сейм мог стаць прэцэдэнтам у барацьбе караля са шляхецкімі вольнасцямі. Таму большасць ухапілася за выкрык аднаго пасла: "Не дазваляю!". У іншых умовах, калі б большасць не хацела гэтага, такая сітуацыя не магла здарыцца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, канчатковыя рашэнні сейму – гэта вынік кампрамісу і павагі да думкі меньшасці. На жаль, у другой палове XVII ст. пра гэтыя ідэалы забыліся, а сейм РП стаў ахвярай партыкулярызму, асабістых інтарэсаў і палітычных гульняў суседніх дзяржаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Чаплиньский, В. Органы государственной власти в Польше XVI – XVII веков [Электронный ресурс] / В. Чаплиньский // Белорусская цифровая библиотека. – Режим доступа: https://library.by/portalus/modules/belorussianlaw/readme.php?subaction=showfull&id=1512741275&archive=&start_from=&ucat=&. – Дата доступа: 12.07.2022.
2. Konopczyński, W. Geneza "liberum veto" / W. Konopczyński // Przegląd Historyczny, 1/3. – 1905. – S. 315-358.
3. Lewandowska-Malec, I. Sejmy rozerwane i zerwane w XVII stuleciu Die zerrissenen und abgebrochenen Sejms im 17. Jahrhundert [Electronic resource] / I. Lewandowska-Malec // Repozytorium Instytucjonalne Krakowskiej Akademii iv. Andrzeja Frycza Modrzewskiego. – Mode of access:https://repozytorium.ka.edu.pl/bitstream/handle/11315/27840/LEWANDOWSKA_Sejmy_rozerwane_i_zerwane_2009.pdf?sequence=1&isAllowed=y. – Date of access: 21.07.2022.
4. Wójcik, Z. Liberum Veto / Z. Wójcik. – Kraków: Krajowa Agencja Wydawnicza, 1992. – 72 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова